# Летам рыхтуем не толькі сані, але і...

**27 жніўня адбылася калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. І адным з пытанняў яе парадку дня быў стан і падрыхтоўка ўстаноў культуры да работы ў зімовы перыяд.**

Як зазначыў начальнік Упраўлення капітальнага будаўніцтва і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Віктар Рымашэўскі, зараз асноўныя задачы, што стаяць перад установамі культуры ў справе падрыхтоўкі да зімы, — заканчэнне да пачатку кастрычніка поўнага рамонту цепласетак, а таксама стварэнне запасаў паліва, неабходных для нармальнай працы. Прычым сёлета працягваецца леташняя тэндэнцыя павелічэння колькасці ўстаноў культуры, асабліва рэгіянальнага падпарадкавання, якія пераходзяць на працу з мясцовымі відамі паліва. У лідэрах па гэтым паказчыку — Магілёўская і Гомельская вобласці. Дарэчы, Магілёўшчына ўвогуле з'яўляецца перадавіком у справе паліванарыхтоўкі — абласныя патрэбы ў паліве забяспечаны на 77 працэнтаў, астатнія вобласці крыху адстаюць ад яе.

Сёлета ў працэсе падрыхтоўкі да зімы актыўна працягваецца і праца па скарачэнні энергазатрат. Ужо да гэтага часу ва ўстановах галіны з'явілася 4200 энергазберагальных установак на агульную суму 6980 мільёнаў рублёў. Гэта, безумоўна, стане добрай падмогай у справе фарміравання энергетычнай бяспекі.

Аднак, бадай, самым "гарачым" пытаннем калегіі сталася абмеркаванне рэалізацыі мінулагодняга рашэння "Аб выкананні ўпраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама закону "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь". І не дзіўна, бо развіццё і дзейнасць публічных бібліятэк на сучасным этапе Міністэрства культуры трымае на пастаянным кантролі.

Начальнік упраўлення культуры Гродзенскай вобласці Аляксандр Лойка ў сваёй справаздачы адзначыў, што ўсе даручэнні вобласцю выкананы. У прыватнасці, прыпынена скарачэнне колькасці бібліятэчных устаноў. Так, калі ў 2007 годзе на Гродзеншчыне было закрыта ажно 475 бібліятэк, дык сёлета — толькі тры, прычым яны рэарганізаваны ў бібліятэкі-клубы.

Другое істотнае пытанне, якое з асаблівай вастрынёй паўстала перад бібліятэкамі не толькі Гродзенскага рэгіёна, але і ўсёй краіны, — рэзкае скарачэнне бібліятэчных фондаў, у першую чаргу за кошт таго, што ў апошнія гады ішло актыўнае спісанне так званай старой і "неактуальнай" літаратуры. Па словах начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, гэты працэс удалося прыпыніць, і за сем месяцаў бягучага года бібліятэкі вобласці спісалі толькі 21 тысячу адзінак, прычым гэта ў большасці сваёй — перыёдыка. У той жа час, палепшыліся справы з камплектаваннем фондаў новымі выданнямі. Так, Гродзеншчына ў 2008 годзе выдаткавала на гэта 2,1 мільярда рублёў. Да таго ж, дзякуючы адпаведнаму Указу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сёння мясцовыя кіраўнікі — старшыні райвыканкамаў — проста абавязаны выдзяляць грошы для закупкі бібліятэкамі новых кніг, і гэта не можа не радаваць. Працягваецца праца і па забеспячэнні бібліятэк, у тым ліку ў раёнах і аграгарадках, камп'ютэрамі і Інтэрнетам, што, безумоўна, адкрые перад гэтымі ўстановамі новыя магчымасці ў абслугоўванні насельніцтва.

Між тым, намеснік міністра культуры Віктар Кураш зазначыў, што пры ўсёй пазітыўнасці паказчыкаў, якія прадставіў начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, сітуацыя ў бібліятэчнай справе, у тым ліку і ў іншых рэгіёнах краіны, далёкая ад таго, каб спакойна спачываць на лаўрах. Гвалтоўнае знішчэнне кніжных фондаў шляхам спісання старой літаратуры ўдалося прыпыніць, аднак неабходна яшчэ больш актыўна працаваць і над папаўненнем фондаў новымі выданнямі. Сёння мала якія з айчынных бібліятэк могуць у гэтым плане адпавядаць міжнародным стандартам ЮНЕСКА. Тая ж Гродзеншчына па камплектаванні фондаў мае паказчык у 76 экзэмпляраў на тысячу насельніцтва, у той час як міжнародны стандарт — 250. Таму і каэфіцыент абарачальнасці фондаў (пры міжнароднай норме 5) мы маем сёння ўсяго 1,2.

Не былі абдзелены ўвагай на калегіі і цэнтры прававой інфармацыі, што ствараюцца сёння на базе бібліятэк. У прыватнасці, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матвейчук адзначыў неабходнасць больш дакладнага вызначэння іх статуса, функцый і задач, якія ставяць перад сабой супрацоўнікі такіх цэнтраў. На першы погляд, відавочна, што яны пакліканы забяспечыць насельніцтву ў рэгіёнах магчымасць аблегчанага і больш поўнага доступу да заканадаўчых рэсурсаў. Але ж адсутнасць, як правіла, у бібліятэкараў, што працуюць у гэтых цэнтрах, юрыдычнай кваліфікацыі ператварае іх выключна ў пошукавікоў-пасрэднікаў, без права кансультавання наведвальнікаў па тых ці іншых пытаннях. Для таго, каб пазбегнуць падобнай фармалізацыі дзейнасці, неабходна пастаянна прыцягваць да сваёй работы больш вузкіх спецыялістаў адпаведнай кваліфікацыі: юрыстаў, адвакатаў... Яшчэ адным важным накірункам дзейнасці падобных цэнтраў была вызначана неабходнасць камплектавання іх уласнай заканадаўчай базы не толькі агульнадзяржаўнымі дакументамі, але і дакументамі, пастановамі, рашэннямі рэгіянальнага і мясцовага значэння. Бо, як паказвае практыка, акурат апошнія аказваюцца вельмі часта запатрабаванымі насельніцтвам у рэгіёнах.

Было закранута і пытанне кадравага забеспячэння бібліятэчнай галіны, у прыватнасці, пытанне павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў. Як зазначыў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі, у гэтай справе яшчэ маюцца рэзервы. Так, разумеючы неабходнасць пастаяннага павышэння прафесійных навыкаў, бібліятэка не толькі рэгулярна праводзіць рэспубліканскія семінары па тых ці іншых актуальных прафпытаннях, але і падрыхтавала шэраг дапаможнікаў і метадычных матэрыялаў для забеспячэння самаадукацыі бібліятэчных работнікаў у рэгіёнах. На жаль, сёння гэты досвед практычна незапатрабаваны, і нярэдка, па словах Матульскага, многія з тых рэсурсаў, што НББ прадстаўляе ў бібліятэках рэгіянальных, аказваюцца незапатрабаванымі. Прыкладам, карыстанне віртуальнай чытальнай залай, якая працуе сёння ў шэрагу абласцей і забяспечвае доступ да вялікай колькасці электронных версій навуковых выданняў не толькі нашай краіны, але і Расіі, і далёкага замежжа за апошнія 50 гадоў, у рэгіёнах практыкуецца ў шмат разоў радзей, чым у Мінску. Найперш таму, што самі бібліятэкары на месцах не заўсёды ведаюць, як імі карыстацца і, адпаведна, не даюць пра гэта вычарпальнай інфармацыі сваім наведвальнікам. А між тым, задача забеспячэння гарантаванай роўнасці сацыяльна-культурнага абслугоўвання насельніцтва паўсюль у нашай дзяржаве мусіць быць у полі ўвагі не толькі ў Міністэрстве, але, у большай ступені, на абласных і рэгіянальных узроўнях — побач з тымі, для каго гэтыя гарантыі створаны.

**Таццяна КОМАНАВА**